Новополоцкий Государственный Политехнический колледж

# Презентация по теме «Пясняр роднай зямлі, жыцце и творчасць Якуба Коласа»

Составитель: учащийся 181г. Махаев Артем

# Пачалася яго гісторыя 22 кастрычніка 1882 года, у весцы Акінчіцы, у сямье лясніка


©Oleg Babinets


У ГЭТАЙ ХАЦЕ
Ў 1885 - 1890 ГАДАХ
ЖЫЎ ВЯЛІКІ ПЯСНЯР
БЕЛАРУСКАГА НАРОДА
ЯКУБ КОЛАС
КАНСТАНЦІН МІХАЙЛАВІЧ
МІЦКЕВІЧ

- Якуб Колас праваслаўны, ахрышчаны ў Стаўбцоўскай царкве. Бацька, Міхаіл Казіміравіч Міцкевіч, служыў леснікам у князя Радзівіла. Маці, Ганна Юр'еўна (дзяв. прозвішча Лёсік), была хатняй гаспадыняй.
- Акрамя Кастуся ў сям'і Міцкевічаў расло яшчэ сямёра дзяцей (чатыры браты і тры сястры). Дзіцячыя гады будучага пісьменніка прайшлі ў лесніковых сядзібах Ласток (Сухошчына), Альбуць, што недалёка ад в. Мікалаеўшчына, адкуль бацькі былі родам.





- У душу Якуба Коласа западалі вобразы герояў казак, легенд, розных апавяданняў, пачутыя ад сваіх родных, ад сялян, якія заходзілі у хату лесніка.Але больш за ўсе ад дзядзькі Антося – добрага, спагадлівага чалавека, багатага адаронага ад прыроды. Ён валодаў майстэрствам апавядальніка-імправізатара, ведаў шмат розных гісторый і ўмеў цікава расказаць. «Некаторыя казкі , -успамінае Якуб Колас, - ён расказваў па некалькі дзён, на манер вядомай Шахерэзады ». Расказваючы пра падзеі свайго жыцця, дзядзька вельмі паэтычна апісваў малюнкі прыроды, асабліва навальніцы, розныя страшныя гісторыі. «Пры гэтым ён цудоўна ўмеў спалучаць вобраз апавяданняу і сам тон перадачы іх у поўную гармонію з навакольным малюнкам ночы».



© Антон Баранов, 2007

- У 1898г. Якуб Колас пераступіў парог Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, якую паспяхова скончыў у 1902 годзе. У гэты час пісьменнік цікавіўся палітыкай, выступаў на літаратурных вечарах з чытаннем сваіх вершаў.
Семінарыя паглыбіла веды паэта, духоўна ўзбагаціла яго. Самае галоўнае – тут ён пазнаёміўся з класікамі рускай і замежнай літаратур. Вельмі цікавіла маладога семінарыста народная паэзія. Летнія канікуы ён праводзіў дома, дзе са сваіх аднавяскоўцаў Якуб Колас запісваў песні, казкі, апавяданні. Усё гэта было патрэбна юнаку, які марыў стаць пісьменнікам.

Яшчэ ў дзяцінстве абудзілася ў Якуба Коласа пачуццё прыгожага.Спевы жаваранка, посвіст ветру ў полі, бульканне ручайка: усё гэта знаходзіла водгук у дзіцячай душы, кранала і хвалявала.Хацелася аб усім гэтым расказаць сваім блізкім і знаёмым.

У раннія дзіцячыя гады праявлася і цяга да паэзіі. Пісаць вершы пачаў у двенаццаці гадовым ўзросце, спачатку на русскай мове. Першым творам была байка "Лісіца і варона".Яго брат высмяяў гэтую байку, і Колас больш не адважваўся чытаць свае творы нікому.

У семінарыі талент юнака Міцкевіча заўважыў і падтрымаў Фядот Андрэевіч Кудрынскі – выдатны педагог, вораг семінарскай руціны. Кудрынскі сам пісаў вершы, вучыў любіць і разумець мастацкае слова.


Якуб Колас

- Настаўнічаў у вёсках Люсіна Ганцавіцкага раёну (1902—1904), Пінкавічы Пінскага раёну (1904—1906). За рэвалюцыйную прапаганду ў 1906 годзе быў пераведзены з Пінкавічаў у Верхменскую народную вучэльню Ігуменскага павету. За ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе 10 ліпеня 1906 года быў звольнены. Зімой 1906—1907 гг. жыў ва ўрочышчы Смольня, вёў прыватную школу. У траўні-чэрвені 1907 г. працаваў у газеце «Наша ніва» ў Вільні, быў загадчыкам літаратурнага аддзелу, але на загад паліцыі мусіў пакінуць Вільню. У 1908 годзе — праца ў прыватнай школе ў вёсцы Сані Талачынскага раёну.


НАША НІВА

15 верасня 1908 г. за ўдзел у настаўніцкім з'ездзе і нелегальную работу быў асуджаны на тры гады, адбываў пакаранне ў мінскім астрозе.

І за кратамі мінскага астрога паэт заставаўся непахісным у барацьбе з царызмам. Ён пісаў творы, поўныя грамадзянскай мужнасці, пасылаў іх на волю сваім сябрам. У цыкле вершаў «Песні няволі» ўслаўляў свабоду, вернасць народу. Тут жа, у турме,  з’явилася думка напісаць вялікія эпічныя творы, и ён пачаў працаваць над паэмамі «Новая зямля» і «Сымон Музыка». У 1910 годзе выйшаў з друку падрыхтаваны супрацоўнікамі рэдакцыі «Нашай нівы» першы зборнік вершаў «Песні-жальбы».

15 верасня 1911 года Колас быў вызвалены.

Былі … ыя
з'явы
«Тоўс
«Пра … ». У
савец … ця»
(1926 … улле»
(1922 … ай
глуш … , «На
рубяж … мон-
музы … (1926,
экран … ленае
выда
«Адш … ў
«Наш
(1943 … 946),
зборн … та»
(1947
«Жы … -
паэм … Рак-
вусач … 1),
«Вер
стары … ў
шэра




Евангелие учительное.
Москва, 1633.
Феофилакт Болгарский. Евангелие с
толкованием (благовестное). Москва, 1649.



П. Броўку, А. П. і Д. Варвашэні

1

З вышыні Прэзідыума.

Мне шмат чаго відаць са ўзвыша:
Знайшоў вачамі я Пятруся —
Сядзіць, прыгнуўся, нешта піша,
А што? абсмы? сказаць баюся,
Паэму, верш, ці так нататкі,
А можа нават эпіграму
На нашы хібы, непаладкі,
Каб у жыцці менш было хламу.

Яшчэ сказаў-бы і шмат болей,
Ды штосьці вочы служаць блага —
Ці-ж не пагодзіцца са злой доляй,
З такой заганай, прыкрай плямай?
О, не! крый божа! не, ніколі!
Вось вобліч я спаймаў Ларысы,
Такі прывабны і вясёлы!
Ды зноў-та: засціць чэрап лысы,
Як шар більярдны, ўвесь голы...

Не, лепш сядзець, як падабае,
Бо не ўтрымаць сяноўкі ў рыме,
Паслухаць лепей, аб чым бае
Таварыш добры, Варвашэня.

Якуб Колас
17 XII 1955 г.



2

…бродскому

…, а мы сябры:
… і ты стары,
…, і я адзін —
…, усюды клін.
… глядзіць ураннаваd —
… новага мы, брат?

… мелі вёсны,
… іншыя песні,
… аткамі кросны —
… даць не ўскрэне.

…к, дзе носа
… нам не трэба:
… огагаласім,
… аўна неба.

Якуб Колас




## Водгулле

Ці коска зазвоніць у час касавіцы,
Ці песню дзяўча запяе,
Ці неба заззяе ў агнях бліскавіцы,
Ці вецер задзьме, завые,

Ці гром гучнабежны пракоціцца ў хмарах,
Ці грукне над лесам пярун,—
Усё адклікаецца ў вольных абшарах,
Усе іх дакранаецца струн.

А ты, калі гора каго напаткае,
Ці жальба пачуецца, плач,
Або запануе дзе крыўда ліхая —
На ўсё адгукніся, адзнач.

А радасць пачуеш, надзеі ўзоўюцца,
Каб добрыя весці радаць,
Няхай тады струны твае засмяюцца
І песняю шчасця гучаць.

1921 г.

У 1914 годзе пачалася імперыялістычная вайна. Яна прымусіла Якуба Коласа пакінуць Беларусь. Ён разам разам з сям'ёй эвакуіраваўся ў Дзімітраўскі павет Маскоўскай губерніі, пачаў настаўнічаць у сяле Старыкава.

У 1915 г. паэта мабілізавалі ў армію. Служыў ён у запасным батальёне, а пасля заканчэння Аляксандраўскага ваеннага вучылішча – у Пермскім запасным палку, адкуль у 1917 г. Патрапіў на румынскі фронт.

На Куршчыне,куды ён пераехаў, сустрэў Кастрычніцкую рэвалюцыю. Пасля перамогі Колас пачаў будаваць новае жыццё.

На Куршчыне ён працаваў настаўнікам, потым школьным інспектарам Абаянскага аддзела народнай асветы, шмат увагі аддваў культурна-асветніцкай рабоце



Колас выступаў як паэт, празаік, драматург, дзіцячы пісьменнік і педагог, публіцыст, крытык, перакл







# Памёр 13 жніўня ў 1956 г. Быў пахаваны на ваенных могілках у Мінску.

- «Колас аддаў увесь свой талент народу, у гэтым яго хараство і веліч,— пісаў Іван Мележ.— Ен жыў у цяжкі, але справядлівы час, ён не зазнаў лёсу сваіх неапетых і неаплаканых паплечнікаў. падобных да героя паэмы «Сымон-музыка», ён выйшаў на не абсяжныя «прасторы жыцця», і голас яго загучаў не толькі для свайго разняволенага народа, але і стаў чуцён па ўсёй зямлі».




1882
1956

# Яго мы запомнім назаўсёды!







Музей Якуба Коласа



**Спасибо за внимание!!!**